• больш ужывальныя ў нашым слоўным мастацтве цвёрдыя вершаваныя формы перасатвараюцца, разнявольваюцца ў межах магчымага (танкі і ясачкі Р. Барадуліна, хоку і пункціры А. Разанава);

• з’яўленне і існаванне названых вершаваных «наватвораў» сведчыць пра развіццё беларускай паэзіі ў накірунку медытатыўнасці, афарыстычнасці, інтэлектуальнасці.

**Бібліяграфічны спіс:**


1. Рагойша, В. П. Паэтычны слоўнік / В. П. Рагойша. – 3-е выд., дапрац. і дапоўн. – Мінск : Бел. навука, 2004. – 576 с.
2. Разанаў, А. Дождж: возера ў акупунктуры: пункціры / А. Разанаў. – Мінск : І. П. Логвінаў, 2007. – 162 с.
3. Сільнова, Л. Ластаўка ляціць... : вершы / Л. Сільнова. – Мінск : Маст. літ., 1993. – 96 с.
4. Законнікаў, С. І. Дол: вершы і паэмы / С. І. Законнікаў. – Мінск : Галіяфы, 2008. – 496 с.
5. Барадулін, Р. Збор твораў : у 5 т. / Р. Барадулін. – Мінск : Маст. літ., 1999. – Т. 3 : Паэмы, вершы. – 335 с.
6. Барадулін, Р. Ксты / Р. Барадулін. – Мінск : Рым.-катал. парафія св. Сымона і св. Алены, 2005. – 472 с.


# ВЫРАТАВАННЕ КАХАННЕМ (ПАВОДЛЕ АПОВЕСЦІ ВАСІЛЯ БЫКАВА «АЛЬПІЙСКАЯ БАЛАДА»)


***В. В. Казлова***

*УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», г. Мінск*

*Навуковы кіраўнік – І. М. Мішчанчук, кандыдат філалагічных навук, дацэнт*



**Анатацыя.** У артыкуле даследуецца адметнасць раскрыцця тэмы кахання паводле «Альпійскай балады» Васіля Быкава, праводзіцца думка пра здольнасць найвышэйшага пачуцця змяніць чалавека, асуджанага на смерць.



**Ключавыя словы:** каханне; гуманізм; выратаванне; паэтызацыя пачуццяў; вышыня духу чалавека.


Каханне – гэта самае цудоўнае, што можа адчуць кожны чалавек. Яно можа пачацца раптоўна, з першага позірку двух людзей. А можа прыходзіць паступова,

пасля доўгіх зносінаў людзей, калі іх нешта аб'ядноўвае. Зразумела, што не адзін пісьменнік не змог абысці тэму кахання ў сваёй творчасці. Васіль Быкаў – пісьменнік, шматгранная творчасць якога не пазбаўлена рамантычнай плыні. Прыкметнымі рысамі рамантызму надзелена і яго аповесць «Альпійская балада», у аснову якой пакладзены пачуцці паміж маладымі людзьмі падчас ваеннай пары.

У аснове твора ляжыць аповед пра тры дні жыцця беларускага салдата Івана і італьянскай дзяўчыны Джуліі, якія ўцяклі з нямецкага палону. Гэта гісторыя пра тры кароткія дні ў Альпах, якія змясцілі ў сабе цэлую вечнасць. Пра тры дні, якія падарылі былым вязням канцлагера бязмежнае каханне і надзею на выратаванне. Аповед пра сапраўднае, глыбокае пачуццё, якое не выбірае час і ўмовы для свайго з'яўлення [2].

Каханне ўварвалася ў жыццё Івана Цярэшкі так нeспадзявана. Пры пабегу з палону менш за ўсё прысутнічала спадзяванне напаткаць жанчыну і закахацца ў яе. Сустрэўшы Джулію, Іван хацеў ад яе пазбавіцца. Ды не дазволіла яго сумленне, чалавечнасць і спагада. І неўзабаве Іван «задыхнуўся, але не ад ветру – а ад нечага незнаёмага, уладарна-лагоднага, вялікага і на дзіва бездапаможнага адначасова, што захіснула яго» [3]. Толькі гэта не каханне мужчыны да жанчыны, а «нешта ні то братняе, ні то бацькоўскае» [2]. Менавіта пачуццё абаронцы, у першую чаргу, напаўняла душу Цярэшкі асаблівай радасцю.

Шчырыя пачуцці, бязмежнае каханне ўсё больш і больш напаўнялі Івана, што і паспрыяла завастрэнню пісьменніцкай увагі да дэталяў, прыроды і навакольнага свету. Радасць яднання са светам, з кожнай дробяззю прыроды і нават з сонцам на небе выцясняла са свядомасці малюнкі крывавай вайны, успаміны пра складаны лёс і трывогу за заўтрашні дзень. «Цяпер, у гэтым запаведніку хараства, ля страчанага і знойдзенага ўжо дарагога яму чалавека, Івану зрабілася так па-дзіцячаму радасна і хораша, як не было, мабыць, ніколі за ўсё яго невялікае жыццё. І ён прагна душой піў гэтую нечаканую харашосць, і не стараючыся нават даўмецца, адкуль яна і што ў ім сталася, – проста ён быў па-чалавечаму шчаслівы, і ўсё» [3].

Вобраз італьянскай дзяўчыны Джуліі – белазубая ўсмешка, чорныя вочы, гнуткі стан, вострыя грудзі, чорныя бровы, бяздумная прага да свабоды – важныя рысы для мастацкага разумення твора. Аўтар стварыў прывабны вобраз дзяўчыны, паказаў усю моц сімпатыі да яе, з зачараванасцю дэманстраваў увесь унутраны свет. Асабліва захапляе паказ перажыванняў і пачуццяў Джуліі.

Дзяўчына ўраўнаважвае неспакойнага і супярэчлівага Івана. Яна натхняе і напаўняе яго разбітае сэрца прагай да жыцця, верай у заўтрашні дзень для іх нелагічнага саюзу. Джулія тонка адчувае пачуцці і настрой Івана.

У нечаканым і незвычайным каханні юнакоў бачна вялікая прага да сумеснай шчаслівай будучыні. Адчуванне небяспекі, пераследвання ворагаў, пабег, які ўжо не першы ў Івана, не перашкодзілі героям даць волю сваім

пачуццям і даць шанц шчыраму каханню. І вялікая праўда ў тым, што спакутаваныя героі Васіля Быкава адчуваюць *«духмянасць зямлі, макавы водар»* [3] альпійскага лугу і *«спякотны бляск высокага неба»* [3] у гарах.

*«Дзяўчына моўчкі замерла, ён прыгарнуў яе аберуч і сціх. Стала ціха, ціха, і ў гэтую цішыню велічна, як з нябыту ў вечнасць, ліўся, шумеў, булькатаў горны паток. Хацелася растварыцца, знікнуць у яе трапяткіх абдымках, сплыць у вечнасць з патокам, увабраць з зямлі ўсю яе моц і самому стаць зямной магутнасцю – шчодрай, ціхай, пяшчотнай»* [3], – адзначае В. Быкаў, перадаючы пачуцці сваіх герояў падчас найбольшага душэўнага ўзрушэння. У гэтым бачна прага да адчування хараства апошніх момантаў жыцця, імкненне ўмясціць у душы прыгажосць свету, якая хутка для гэтых юнакоў можа бясследна знікнуць.

Жаданне кахаць *«за адзін крок да смерці»* [3], жыць пачуццямі за імгненне да небыцця не з'яўляецца прыкметай слабасці, аўтар падкрэслівае неверагодную сілу былых вязняў, непрыняцце наканавання і смерці, з якой ніколі не зможа прымірыцца годная асоба.

Васіль Быкаў выступае як палымяны гуманіст, калі паказвае дзікасць і недарэчнасць жорсткага фашызму, яго зверствы ў супастаўленні з адданай пачуццёвасцю, чалавечнасцю простых людзей і прыгажосць жыцця наогул.

*«Нешта святочнае, замілавана-сардэчнае лунала над гэтымі гарамі і лугам, не верылася нават у небяспеку, у палон і магчымую пагоню і думалася: ці не прысніў увесь мінулы паўгадавы жах лагераў з эсэсманамі, смерцю, смуродам крэматорыяў, несціханым брэхам аўчарак? А калі ўсё тое было сапраўды, то як побач з ім магло існаваць на зямлі гэтае бессмяротнае хараство прыроды, якая гэта вялікая сіла жыцця аддзяліла-адасобіла яе чысціню ад злачыннае ашалеласці людзей? Але тое агіднае, на жаль, не прыснілася, яно не было зданню – іх размаляваная палосамі і кругамі вопратка штохвілінна напамінала аб тым, што было і ад чаго яны канчаткова яшчэ не адкараскаліся. І цяпер тут, сярод першатворнае чысціні зямлі, гэтае іх адзенне здалося Івану такой нясцерпнай знявагай чалавечнасці, што ён хуценька сарваў з сябе гэтую курту і загарнуў, каб не бачыць яе, у скуранку»* [3].

Каханне Івана і Джуліі напоўнена высокай паэтычнай і гуманістычнай змястоўнасцю. Дзякуючы сіле мастацкага слова, каханне застаецца дакладным і пераканальным, нягледзячы і на тое, што яно ніяк не стасуецца з страшнымі рэаліямі вайны, хоць здаецца часам і немагчымым. Васіль Быкаў праз каханне дэманструе ўнутранае багацце юнака, вышыню духу чалавека падчас вайны. Іван Цярэшка ваюе не толькі за Радзіму і свабоду, але і за асабістае права на каханне. І гэта таксама гераічны подзвіг.

Іван застаецца верным Джуліі да апошніх хвілін свайго жыцця. Сурова, з нейкай велічнаю стрыманасцю Чалавек гіне ў няроўным паядынку са звярамі. Ён гіне мужна, прымае смерць з высокай годнасцю, паклаўшы сваё жыццё на алтар больш чым нерэальнага шанцу на выратаванне, які нечакана аказаўся ў Джуліі.

*«З раптоўнай сілай ён схапіў яе за каўнер і штаны, ускінуў над галавой і, як здалося самому, шалёна шпурнуў нагамі ў прадолле. У апошняе імгненне паспеў згледзець, як распластанае цела мільганула цераз карніз, а ці трапіла яна на снег, ён не бачыў. Ён толькі зразумеў, што самому з хворай нагой яму не скочыць»* [3].

Іван не быў упэўнены, што каханая застанецца жывой пасля такога падзення, але не гэта было галоўным для яго ў такі страшны момант. Пачуцці да Джуліі не далі яму дазволіць дзяўчыне загінуць у пастцы раз'юшаных звяроў: ён штурхнуў італьянку ў абрыў, з якога, на яго думку, нельга было вярнуцца, але той стаў працягам жыцця для яе і канцом – для яго.

Васіль Быкаў, выкарыстоўваючы прыёмы паэтызацыі пачуццяў Івана і Джуліі, застаўся далёкім ад пагоні за сентыментальнасцю і ад рамантызацыі вайны, яе расквечвання, увогуле любога ўпрыгожвання, як падаецца, непрымальнага для пісьменніка, які ўсё жыццё імкнуўся да праўдзівасці.

У аповесці пераважае характэрная для аўтара атмасфера трагедыйнасці жыцця, адцененая сцэнамі кахання. Аднак гэта атмасфера нібыта перакрэсліваецца выратаваннем італьянкі. Тым не менш і гэта можна патлумачыць мастацкімі задачамі: немагчымае ў такіх абставінах выратаванне спатрэбілася для таго, каб праз памяць іншаземкі ўвекавечыць адбіты ў свядомасці людзей розных краін подзвіг савецкага салдата, які вызваліў паўсвету ад чумы [1].

Твор задуманы як гераічная балада пра цану чалавечай адвагі, сапраўдную моц кахання. В. Быкаў пры адлюстраванні цёплых і шчырых узаемаадносін паміж людзьмі ў ваенны час прагне паказаць, што каханне можа служыць узбуджальнай, узнёслай сілай. Вайна выступае і як «зводніца» Івана і Джуліі, і як «разлучніца». Аповесць «Альпійская балада» характарызуецца рамантычным паказам пачуццяў, паэтызацыяй прыроды.

## Бібліяграфічны спіс:

1. Быкаў, В. Альпійская балада [Электронны рэсурс] / В. Быкаў // Беларуская палічка: беларуская электронная бібліятэка. – Рэжым доступу: http://knihi.com/Vasil_Bykau/Alpijskaja_balada.html. – Дата доступу: 20.03.2023.

2. Станулевіч, І. Ваеннае каханне вачамі Васіля Быкава / І. Станулевіч // Роднае слова. – 2000. – № 9 – С. 8–12.